# ПУНКТ АДЛІКУ — КАСТРЫЧНІК СЕМНАЦЦАТАГА

**Іван ПАЛЯКОЎ,**
**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**

У нас прынята гаварыць, што сапраўдная гісторыя Беларусі пачынаецца з 7 лістапада 1917 года. Менавіта Кастрычніцкая рэвалюцыя прадаставіла нашаму народу права на дзяржаўную самастойнасць, адкрыла дарогу да сацыялізму. Нямногім больш года пасля рэвалюцыі Беларусь была аб'яўлена Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай.

Калі мы пачыналі будаваць сацыялістычнае грамадства, Камуністычная партыя вылучыла задачу пераадолець эканамічнае і культурнае адставанне раней прыгнечаных народаў. Інакш кажучы, трэба было забяспечыць не толькі юрыдычную, але і фактычную роўнасць усіх нацый і народнасцей краіны. Гэта была невымерна цяжкая, складанейшая праграма. Ні адно грамадства яшчэ не ставіла перад сабой такой мэты. Мы яе паставілі і дабіліся выдатных вынікаў.

Вось як гэта адбывалася ў Беларусі. Расійская Федэрацыя ва ўмовах разрухі, выкліканай замежнай інтэрвенцыяй і грамадзянскай вайной, сама адчувала вострую нястачу ва ўсім, але пасылала беларускім працоўным хлеб, цукар, соль, мануфактуру, газу. Урад РСФСР асігнаваў буйныя грашовыя сродкі, пасылаў сыравіну, прамысловае абсталяванне, будаўнічыя матэрыялы для ўздыму народнай гаспадаркі Беларусі.

З першых жа пяцігодак планаванне народнай гаспадаркі вялося з такім разлікам, каб з найбольшай інтэнсіўнасцю развівалася народная гаспадарка і культура раней адсталых раёнаў.

Амаль удвая вышэйшыя, чым па краіне, былі тэмпы індустрыяльнага развіцця Беларусі і ў наступныя гады. У нашай рэспубліцы стваралася энергетычная база, галіны цяжкай індустрыі, галоўным чынам машынабудавання. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны аб'ём прамысловай вытворчасці ў БССР у параўнанні з дарэвалюцыйным вырас у восем разоў.

Калгасны лад, абапіраючыся на машынную тэхніку, значна павялічыў вытворчыя сілы вёскі.

Мы нярэдка задумваемся над тым, як далёка мог бы пайсці Савецкі Саюз, каб не гітлераўская агрэсія. І ўсё-такі, дзякуючы нябачанаму энтузіязму працоўных, Краіна Саветаў у кароткі тэрмін аднавіла разбураную вайной народную гаспадарку. Беларусі, напрыклад, спатрэбілася ўсяго пяць год, каб аднавіць даваенны прамысловы патэнцыял. А пачыналі ж мы фактычна з нулявой адзнакі: у руінах ляжалі ўсе заводы, фабрыкі, электрычныя і машынна-трактарныя станцыі, звыш двухсот гарадоў і раённых цэнтраў, дзевяць тысяч дзвесце вёсак. У рэспубліцы загінуў на вайне кожны чацвёрты жыхар, многія раёны наогул абязлюдзелі.

Сёння прамысловасці Беларусі патрэбны ўсяго два няпоўныя дні, каб выпусціць столькі ж прадукцыі, колькі яна давала ў дарэвалюцыйны час за год, і толькі два тыдні, каб выпрацаваць яе ў аб'ёме перадваеннага, 1940 года. З заводскіх канвеераў кожныя тры мінуты сыходзіць трактар, кожныя дзесяць мінут — грузавы аўтамабіль і складаны металарэзны станок. У рэспубліцы развіты энергетыка, маторабудаванне, вытворчасць электроннай тэхнікі, здабыванне нафты і мінеральных угнаенняў, хімічная і нафтахімічная прамысловасць. Пералік вялікі, ён уключае ў сябе больш за сто галін індустрыі.

Аб цяперашніх тэмпах эканамічнага развіцця Беларусі можна меркаваць хаця б па такому прыкладу. За дзесяцігоддзе (з 1966 па 1975 год) яе прамысловы патэнцыял павялічыўся ў тры разы. У другой палавіне гэтага перыяду кожныя дваццаць дзён уступаў у строй буйны завод. У дзесятай пяцігодцы аб'ём прамысловай вытворчасці ўзрасце яшчэ прыкладна ў паўтара раза.

Больш як 400 назваў беларускіх вырабаў экспартуюцца ў 86 краін.

Беларусь складае неад'емную частку ўсяго эканамічнага арганізма Савецкага Саюза і развіваецца на аснове адзінага народнагаспадарчага плана.

Калісьці, на заранку Савецкай улады, удзельнікі адной сялянскай канферэнцыі ў Беларусі запісалі ў рэзалюцыі, што «заараюць разруху сваімі плугамі і мазолістымі рукамі глыбока ў зямлю». У гэтым вобразным выразе адбіліся і векавая галеча селяніна-беларуса, і яго мара аб новым жыцці. Цяпер у рэспубліцы 2 850 калгасаў і саўгасаў, якія ўяўляюць сабой буйныя механізаваныя гаспадаркі з развітай вытворчасцю малака, мяса і іншай прадукцыі. За лік саюзнага бюджэту на сотнях тысяч гектараў праводзяцца меліярацыйныя работы. Беларускае Палессе, некалі балотны край, становіцца жытніцай рэспублікі.

Беларусь стала рэспублікай суцэльнай пісьменнасці. Да Вялікага Кастрычніка ў нас не было ніводнай вышэйшай наву-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке